ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА
СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (1097) ● Чацвер, 19 чэрвеня 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

ЗА КАНДЫДАТАЎ НАРОДА

З 6 гадзін раніцы 15 чэрвеня ажыу выбарчы ўчастак № 1. Сюды выканаць свой грамадзянскі абавязак — аддаць галасы за кандыдатаў у дэпутаты Вярхоунага Савета БССР і мясцовых органаў улады прыйшлі у гэты дзень студэнты, што жывуць у інтэрнаце № 3, а таксама жыхары вулиц Кірава, Ленінградскай і Міхайлаускага завулка.

Па выбарчаму участку № 1 балацируюцца Р. А. Матусевіч, машыніст цеплавоза лакаматыунага дэпо г. Мінска, — кандыдат у дэпутаты Вярхоунага Савета Беларускай ССР; І. Г. Дабраднін, першы сакратар Кастрычніцкага райкома КПБ г. Мінска, — кандыдат у дэпутаты Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоуных, а таксама Р. І. Юрыс, мантажніца завода «Калібр» вытворчага аб'яднання імя У. І. Леніна; М. А. Копаць, шафёр першага аутапарка; Л. В. Валадзько, прарэктар па навуковай рабоце Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга університэта імя У. І. Леніна; Л. П. Мицкевіч, старшы бібліятэкар університэцкай бібліятэкі і В. Г. Верабей, студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ, — кандыдаты у дэпутаты Кастрычніцкага раённага Савета дэпутатаў працоуных.

— Галасаванне на нашым участку праходзіць актыўна, — расказау старшыня участковай выбарчай камісіі, дацэнт кафедры крымінальнага працэсу Сяргей Пятровіч Бякешка, —з 1431 выбаршчыка да 12 гадзін дня прагаласавала ужо 1197 чалавек.

Нямала сіл уклалі у падрыхтоуку да правядзення выбарчай кампаніі выкладчыкі і студэнты юрыдычнага факультэта, асабліва члены выбарчай камісіі участка. Дакладна і у тэрмін падрыхтаваны і вывераны спісы выбаршчыкау, неабходная дакументацыя. Зроблена ўсё магчымае для таго, каб выбары у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы дэпутатаў працоуных прайшлі на высокім узроуні.

Старшыня адзначае найбольш актыуных членаў выбарчай камісіі. Гэта Тамара Аляксееуна Бялова, выкладчык кафедры грамадзянскага права і працэсу — сакратар выбарчай камісіі і Аляксандр Уладзіміравіч Баркоу, выкладчык кафедры крымінальнага права — адзін з членаў камісіі.

У дзень выбарау усе мы сталі сведкамі і удзельнікамі сапраўднай усенароднай урачыстасці.

Т. САХАШЧЫК.

У гэтым нумары газеты мы друкуем скарочаны даклад заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР, доктара гістарычных навук, прафесара М. Я. Шкляра «Выхаванне камуністычнай перакананасці і непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі у працэсе вывучэння гісторыі КПСС», з якім ён выступіу на Усесаюзнай канферэнцыі «Актуальныя пытанні методыкі выкладання гісторыі КПСС».

ВЫХАВАННЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПЕРАКАНАНАСЦІ

Галоунай задачай выкладання гісторыі КПСС з'яуляецца выхаванне камуністычнай перакананасці у студэнтаў, іх ідэйная загартоука, валоданне ведамі для асэнсавання і тэарэтычнага абагульнення жыццёвай практыкі, выхаванне непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі. Гэта вынікае з ленінскага вучэння, рашэнняу з'ездау партыі, у прыватнасці XXIV з'езда КПСС, з пастаноу Пленумаў ЦК КПСС.

Як гаварыу У. І. Ленін, аб эфектыунасці выхавання камуністычнай перакананасці і непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі можна меркаваць па сацыяльных дзеяннях, якія знаходзяцца ў прамой залежнасці ад узроуню поглядау і маралі чалавека.

Выхаванне марксісцка-ленінскага светапогляду у студэнтау ускладае на выкладчыка гісторыі КПСС асаблівую адказнасць. Гэта выклікаецца тым, што вывучэнне усяго цыклу грамадскіх навук у ВНУ пачынаецца з выкладання гісторыі КПСС. Асаблівая адказнасць выкладчыка гісторыі КПСС усямерна павышаецца ва умовах развітога сацыялізму.

Гэта тлумачыцца, па-першае, узросшымі маштабамі камуністычнага будаунііцтва, прыцягненнем да актыунай стваральнай дзейнасці па будаунііцтву новага грамадства практычна усяго працоунага насельніцтва.

Па-другое, паскоруюся працэс сацыяльнага развіцця. Адбываюцца якасныя змены унутры класау і сацыяльных груп, іх далейшае зближэнне і умацаванне сацыяльнай аднароднасці нашага грамадства. Нам трэба улічваць, што звыш палавіны насельніцтва краіны складае моладзь, значная частка якой з'яуляецца студэнтамі. Выхаванне апошніх — адна з важнейшых задач выкладчыкау гісторыі КПСС.

Па-трэцяе, хутка расце адукацыя і культура савецкіх людзей.

Па-чацвёртае, нельга не улічваць рад важных момантау, якія вынікаюць з сучаснага міжнароднага становішча. Разрадка міжнароднай напружанасці адкрывае новыя, больш шырокія магчымасці для распаусюджання ідэй марксізму-ленінізму. Але у той жа час, як адзначалася на красавіцкім Пленуме ЦК КПСС (1975 г.), яна патрабуе павышэння рэвалюцыйнай пільнасці, узмацнення барацьбы з буржуазнай ідэалогіяй, бо ідэалагічная барацьба набывае усё больш востры і складаны характар.

Распрацоука методыкі выкладання, рост патрабаванняу да метадычнай культуры — адна з важнейшых умоу павышэння эфектыунасці працы выкладчыкаў гісторыі КПСС па фарміраванню марксісцка-ленінскага светапогляду у студэнтау і непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі.

Паляпшэнне методыкі выкладання гісторыі КПСС па фарміраванню камуністычнай перакананасці у студэнтау звязана з рашэннем дзвюх задач: па-першае, з навуковым выкладаннем усяго курса гісторыі КПСС, па-другое, з засваенем гэтага курса студэнтамі, выпрацоукай у іх глыбокага перакананння практычна прысвяціць сябе справе Камуністычнай партыі.

Вядома, што не усякія веды становяцца перакананнем, а толькі тыя з іх, якія выражаюць упэунанасць студэнта у правільнасці палітыкі партыі, гістарычнай неабходнасці будаунііцтва сацыялізму і камунізму, тыя веды, якія праяуляюцца у яго актыунай дзейнасці, накіраванай на будаунііцтва камунізму. Для вырашэння задачы фарміравання камуністычнай перакананасці у студэнтау патрабуецца вялікае педагагічнае майстэрства. Рашэнне гэтай задачы зноу жа звязана з паляпшэннем методыкі выкладання гісторыі КПСС, нашым уменнем даць сістэматычнае, пабуджаючае да разважанняу, да самастойных пошукау выкладанне курса гісторыі КПСС.

Галоунае у паляпшэнні методыкі выкладання —высокая тэарэтычная падрыхтоука выкладчыкау. Ад тэарэтычнай падрыхтоукі выкладчыка залежыць якасць паведамлення і засваення ведау па гісторыі КПСС.

Камуністычную перакананасць можна выхаваць, калі кожную лекцыю, кожны семінар будуць пранізваць: строгая навуковасць, гістарызм, партыйнасць, непарыуная сувязь тэорыі з практыкай, праудзівасць, камуністычная перакананасць і непрымірымасць да буржуазнай ідэалогіі.

Галоуная задача лекцый і семінараў па гісторыі КПСС па выхаванню камуністычнай перакананасці заключаецца у тым, каб навучыць студэнтау пастаянна чытаць і вывучаць працы У. І. Леніна, рашэнні з'ездау і Пленумаў ЦК КПСС. Неабходна усебакова раскрываць ролю У. І. Леніна як тэарэтыка, арганізатара і правадыра Камуністычнай партыі і дзяржавы, сусветнага камуністычнага руху. З вялікай глыбінёй павінна быць паказана роля У. І. Леніна, яго кіпучая дзейнасць на з'ездах партыі, пленумах, канферэнцыях, а таксама паміж з'ездамі.

Важнейшыя патрабаванні, якія прад'яуляюцца да лекцый, можна сфармуліраваць так: высокі ідэйны змест, простая і яркая форма выкладання, сувязь гістарычнага вопыту КПСС з сучаснасцю.

Высокая ідэйнасць лекцый, практычных заняткаў па гісторыі КПСС залежыць у першую чаргу ад глыбокага выкладання тэарэтычных пытанняў на аснове старанна адабранага канкрэтнага гістарычнага матэрыялу. Такія заняткі будуць арыентаваць студэнтау на удумлівую самастойную работу, прывучаць іх уважліва і сістэматычна чытаць першакрыніцы, а таксама вучэбную і іншую літаратуру, будуць развіваць самастойнае мысленне,

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ШЭСЦЬ ОРДЭНАЎ НА ТВАІМ КАМСАМОЛЬСКІМ БІЛЕЦЕ

ГЕРОІКА МІРНАГА СТВАРЭННЯ

Дарагой цаной была дасягнута перамога.

«Ваш сын загінуу смерцю храбрых...» Ваш муж, бацька, дачка... Колькі за чатыры гады вайны прыйшло такіх кароткіх паведамленняў! Пра многіх, загінуушых у баях, закатаваных у фашысцкіх лагерах, угнаных у Германію і там загінуушых, нічога не вядома. Няма савецкай сям'і, куды б не прыйшоу смутак, дзе б не аплаквалі родных — загінула звыш 20 мільёнаў чалавек.

Вайна закончылася, але на скалечанай агнём і металам зямлі засталіся яе страшэнныя сляды: пажарышчы, руіны, разбурэнні... Каласальныя страты панеслі нямецка-фашысцкія захопнікі эканомікі Савецкага Саюза. Яны ператварылі у руіны 1711 гарадоу, больш 70 тысяч вёсак, знішчылі 32 тысячы прамысловых прадпрыемстваў і г. д. У цэлым матэрыяльныя страты нашай краіны у вайне склалі 2600 мільярдау рублёу.

Адразу ж пасля заканчэння вайны партыя вылучыла генеральную перспектыву ўздыму эканомікі на працяглы тэрмін — 15 год. У яе уваходзіу чацвёрты пяцігадовы план аднаулення і развіцця народнай гаспадаркі на 1946—1950 гады, зацверджаны у сакавіку 1946 года Вярхоуным Саветам СССР. Не толькі аднавіць разбураныя раёны і дасягнуць даваеннага узроуню прамысловасці, але і значна павялічыць яго па раду асноуных паказчыкау — такой была гаспадарча-палітычная задача плана.

У яе здзяйсненне закліканы былі унесці свой уклад камсамол, уся савецкая моладзь.

Мабілізацыя сіл моладзі на аднаулен-не народнай гаспадаркі стала важнейшай справай камсамольскіх арганізацый. Яшчэ у 20-я гады члены РКСМ паказали надзвычайныя узоры вытрымкі, сілы волі, упартасці, узнімаючы гаспадарку, разбураную у часы імперыялістычнай і грамадзянскай войнау. Тады і нарадзіліся слауныя працоуныя традыцыі, быу атрыманы першы вопыт удзелу камсамола у гаспадарчым будаунідтве. Камсамольцы 40-х гадоу працягвалі і развівалі гэтыя традыцыі. Палымяны патрыятызм, маральная стойкасць, гераічная праца моладзі пераадольвалі каласальныя цяжкасці ваеннага часу. Усюды, дзе выраша-ліся першарадныя задачы аднаулення, дзе патрэбны были мужнасць, энэргія, самаадданая праца,— там были камсамольцы.

Праз месяц пасля прыняцця Вярхоуным Саветам СССР закона аб чацвёртай пяцігодцы, у красавіку 1946 года адбыуся XV пленум Цэнтральнага Камітэта ВЛКСМ. Ён абмеркаваў пытанне аб удзеле моладзі у выкананні пяцігадовага плана аднаулення і развіцця народнай гаспадаркі на 1946—1950 гады.

Тры тысячы сваіх членау накіравалі на адраджэнне Падмаскоунага вугальнага басейна камсамольскія арганізацыі Маскоускай, Тульскай, Іванаускай, Смаленскай, Яраслаускай і Тамбоускай абласцей. Больш за 5 тысяч камсамольцаў Брэстчыны аднаулялі паравозабудаунічы, сталелцейны, шкляны і цэментны заводы, фабрыкі, чыгуначныя вузлы. Дзесяткі тысяч камсамольцау і моладзі, што з'ехаліся з розных раёнаў краіны, давалі другое жыццё Днепрагэсу, «Запарожсталі», Харкаускаму трактарнаму і многім іншым найбольш важным прамысловым аб'ектам Украіны.

Мінск... У 1946 годзе тут пачалося узвядзенне двух індустрыяльных гігантау — трактарнага і аутамабільнага заводау. ЦК ЛКСМ Беларусі прыняу рашэнне аб прызыве на новабудоулю 5000 добраахвотнікау. У гаркомы і райкомы камсамола пасыпаліся заявы юнакоу і дзяучат. Хутка іх колькасць перавысіла 6 тысяч.

Моладзь будавала буйнейшую ва Узбекістане Фархадскую ГЭС. Горкаускія і яраслаускія камсамольцы удзельнічалі у будаунідтве новых цэхау аутамабільных заводаў.

У краіне сталі ствараццa камсамольска-маладзёжныя брыгады. Ужо у 1947 годзе толькі у прамысловасці іх налічвалася 154 тысячы. Камітэты ВЛКСМ арганізоувалі і накіроўвалі спаборніцтвы брыгад, падтрымлівалі іх цікавыя пачынанні, прапагандавалі вопыт.

Лозунг «Пяцігодку — у чатыры гады!» стаў самым папулярным сярод моладзі. Камсамольцы выступілі ініцыятарамі спаборніцтва працоунай моладзі за выкананне і перавыкананне штодзённых заданняу, за датэрміновае выкананне гадавых норм.

Значных поспехау дасягнуу камсамол у гады першай пасляваеннай пяцігодкі. Палепшылася ідэйна-палітычная і арганізацыйная работа, большым стау вопыт камсамольскага будаунідтва, узрасла роля Саюза у вырашэнні эканамічных праблем... Усё гэта стала магчымым дзякуючы партыйнаму кіраунідтву Саюзам, турботам партыйных камітэтау аб камсамоле, моладзі. Пад кіраунідтвам Камуністычнай партыі Саюз моладзі прайшоу гераічны 30-гадовы шлях барацьбы...

Указ Прэзідыума Вярхоунага Савета СССР ад 29 кастрычніка 1948 года:

«За выдатныя заслугі перад Радзімай у справе камуністычнага выхавання савецкай моладзі і актыуны удзел у сацыялістычным будаунідтве, у сувязі з 30-годдзем з дня заснавання ВЛКСМ узнагародзіць Усесаюзны Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі ордэнам Леніна».

На сцягах камсамола заззяу чацвёрты ордэн.



Добра адказвае на экзамене па гісторыі старажытнай Грэцыі і Рыма студэнтка 4-й групы першага курса гістфака В. Зуева. Прымае экзамен прафесар Ф. М. Нячай. Яму асісціруюць старшы выкладчык К. Л. Рэвяка і аспірант М. І. Мініцкі.

Упэўнена бярэ экзаменацыйны білет М. Палулех.

Фота Т. САХАШЧЫК.

МІЖНАРОДНЫ ГОД ЖАНЧЫНЫ

XXVII сесія Генеральнай Асамблеі ААН па ініцыятыве Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын і раду іншых міжнародных арганізацый абвясціла 1975 год Міжнародным годам жанчыны.

У Савецкім Саюзе, як і у іншых сацыялістычных краінах, правядзенню Міжнароднага года жанчыны надаецца вялікае значэнне. Сацыялізм упершыню у гісторыі абвясціу і здзейсніу на практыцы раунаправе жанчын, адкрыу перад савецкімі жанчынамі вялікія магчымасці удзелу у кіраванні дзяржавай, ва усіх сферах грамадскай вытворчасці.

Намечана шырока адзначыць Міжнародны год жанчыны і у Беларускім дзяржаўным універсітэце. Партыйным камітэтам універсітэта створана камісія па правядзенню Міжнароднага года жанчыны у саставе 9 чалавек. Узначальвае камісію прарэктар па вучэбнай рабоце прафесар А. Я. Малышаў, намеснік старшыні — загадчык кафедры агульнага землязнаўства прафесар В. Ф. Якушка.

Камісія па правядзенню Міжнароднага года жанчыны склала план мерапрыемстваў па БДУ, у якім намечана правесці тэарэтычную канферэнцыю на тэму «Міжнароднае значэнне рашэння жаночага пытання у СССР». Для супрацоунікаў і студэнтаў будуць прачытаны даклады і лекцыі «Роля жанчын-вучоных і выкладчыкаў у падрыхтоуцы высокакваліфікаваных спецыялістаў», «Уклад савецкіх жанчын у развіццё навукі і культуры» і іншыя. У план мерапрыемстваў уключаны семінары «Роля савецкай жанчыны у палітычным, сацыяльным і культурным жыцці краіны» і «Уклад жанчын свету у развіццё сяброускіх адносін і супрацоунідтва паміж дзяржавамі і умацаванне міру». Запланаваны таксама гутаркі ў акадэмічных групах, канферэнцыя чытачоу, прысвечаная творчасці савецкіх жанчын, і многа іншых мерапрыемстваў. У снежні ва універсітэце адбудзецца святочны сход, прысвечаны Міжнароднаму году жанчыны.

(Пачатак на 1-й стар.)

ВЫХАВАННЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПЕРАКАНАНАСЦІ

выпрацоуваць навыкі рабіць абагульненні, выхоуваць камуністычную перакананасць.

Складанасць прадстауляе пытанне аб сувязі гісторыка-партыйнай літаратуры з актуальнымі праблемамі сучаснасці, з жыццём. У гэтым, як і у кожным пытанні, мы павінны зыходзіць з указанняу У. І. Леніна, які заусёды звязвау тэорыю з практыкай, не адрываў ні аднаго практычнага пытання ад тэорыі. Усё гэта рабіла тэорыю зразумелай, а вывады з тэорыі з'яулялся кіраунідтвам да дзеяння.

У. І. Ленін пакінуу нам указанне аб тым, як непасрэдна звязваць прапаганду гістарычнага вопыту партыі з сучаснай палітыкай. Такім чынам, у лекцыях і на семінарскіх занятках па гісторыі КПСС трэба вывучэнне гістарычнага вопыту КПСС зрабіць асновай глыбокага разумення сучаснасці, ходу і перспектыу грамадскага развіцця.

Як гэта зрабіць? Трэба кожнае тэарэтычнае пытанне паказваць як марксізм-ленінізм у дзеянні, звязваць з практыкай, з перажываемым момантам. Вывучаючы тэарэтычныя работы У. І. Леніна, мы абавязаны паказваць ажыццяуленне ленінскага вучэння, звязваць тэарэтычныя пытанні з задачамі сённяшняга дня. Гэта адносіцца і да калектыуных рашэнняу з'ездаў КПСС і Пленумаў ЦК КПСС. Як нам здаецца, ад гэтага залежыць сіла ідэйнага уздзеяння гісторыка-партыйнай навукі, фарміраванне камуністычнай перакананасці ў студэнтаў. Гэтым самым мы будзем выпрацоуваць у студэнтаў сапраўды навуковы, марксісцка-ленінскі падыход да праблем сённяшняга дня.

Багаты матэрыял для разважання атрымліваюць студэнты, калі у працэсе выкладання гісторыі КПСС падвяргаюцца аргументаванай крытыцы антыкамуністычныя, рэфармісцкія і рэвізіяністцкія канцэпцыі.

Праблема крытыкі антынавуковых тэорый займае вялікае месца у праграме курса гісторыі КПСС. Яна мае рад абавязковых зыходных момантаў.

Па-першае, выкладчык павінен указаць вытокі той ці іншай антынавуковай тэорыі, якую ён крытыкуе.

Па-другое, крытыка антынавуковых тэорый прадвызначае паказ лагічных памылак, няправільных зыходных становішчаў, адсутнасць лагічнай сувязі паміж вывадамі і пасылкамі, скажэнне сапраудных фактаў сацыяльнага жыцця.

Па-трэцяе, пры выкрыцці буржуазных і рэфармісцкіх фальсіфікатараў, у ходзе крытычнага разбору павінны быць зроблены глыбокія вывады аб класавых карэннях таго ці іншага сацыяльна-палітычнага вучэння.

Такім чынам, мы бачым, што выкладчыкі гісторыі КПСС маюць у сваім распараджэнні нямала метадалагічных і метадычных сродкаў і прыёмаў выхавання у студэнтаў камуністычнай перакананасці, непрымірымасці да буржуазнай ідэалогіі.

У заключэнне неабходна даць некалькі рэкамендацый.

Па-першае, некаторыя выкладчыкі лічаць, што самастойная праца студэнтаў, гэта значыць працэс пазнання ісціны — гэта пазааудыторныя заняткі. Такое разуменне самастойнай работы ўстарэла. Увесь вучэбны працэс ад пачатку да канца павінен быць разлічаны на самастойную работу студэнта.

Па-другое, некаторыя кафедры працягваюць да цяперашняга часу ператвараць семінары у свайго роду урокі, якія праходзяць па апытальна-адказнай форме. Між тым кожны семінар павінен быць творчым, уключаць абмеркаванне самастойных рэфератаў, дакладаў студэнтаў, а таксама дыскусіі па складаных праблемах, не баючыся так званых «вострых» пытанняў.

Па-трэцяе, кожны выкладчык павінен быць глыбока камуністычна перакананым, палітычна сталым, правільна разумець палітыку КПСС і перакануча яе абараняць.

І, нарэшце, па-чацвёртае. Хачу напомніць, што для выхавання камуністычнай перакананасці вялікае значэнне мае прыцягненне студэнтаў да грамадскай работы, працоунае выхаванне, удзел у працоуным семестры, у конкурсах студэнцкіх навуковых работ, ленінскія залікі, агульнапалітычная практыка і г. д.

Агульны вывад заключаецца у тым, што у працэсе выкладання гісторыі КПСС камуністычную перакананасць можна выхаваць выпрацоукай у студэнтаў здольнасці да самастойнага мыслення, сапастаўлення розных пунктаў гледжання, іх аналізу. Галоўнае заключаецца ў тым, каб правільны вывад выкладчыка быу прыняты студэнтамі не сузіральна і пасіуна, а у разважаннях, сутыкненні розных пунктаў гледжання.

СЕСІЯ НА ЗАВОЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

ДЗЯЎЧАТЫ З ГЕАГРАФІЧНАГА

Чэрвеньскае сонейка не спяшаецца хавацца за гарызонт. Семнаццаць гадзін... «Адстраляліся» студэнты стацыянара, скончылися кансультацыі, але геаграфічны корпус не пусцее. Размова кіпіць то ля адной, то ля другой аудыторыі. Экзамены здаюць завочнікі.

Першы курс сёння здае...

— Гісторыю КПСС! — аднагалосна тлумачаць мне дзяўчаты-завочніцы. — Лекцыі чытаў Аляксандр Уладзіміравіч Царук.

Крыху у баку ад астатніх стаяць тыя, хто ужо здаў. Тут свае размовы — пра адпачынак, пра наступны экзамен, а ён вельмі цяжкі: вышэйшая матэматыка. У гэтым асяроддзі я вылучыла трох першакурсніц, што здалі экзамен аднымі з першых.

— Ядзя Бортнік, Таіса Бігэль, Люда Апанасевіч.

Вось і пазнаёмілася. Слова за словам, і я дазнаюся, што лёс гэтых дзяўчат у многім супадае. Ядзя скончыла Ваукавыскае педвучылішча, тры гады ужо працуе настаўніцай пачатковых класаў; Таіса і Люда — зараз важатыя. Вучацца ва універсітэце з вялікай ахвотай. Геаграфію палюбілі у школе.

— Была у мяне настаўніца Зінаіда Сямёнауна, строгая і добрая. Выкладала у вучылішчы геаграфію так, што мы, шчыра кажучы, гэты прадмет адзін і вучылі,— расказвае Ядзя Бортнік. — Потым многія нашы вучні паступілі на геаграфічнае аддзяленне завочнага факультэта БДУ, у тым ліку і я...

Былі любімыя настаўнікі геаграфіі і у Таісы, і у Людмілы. І яшчэ адна рыса характару зрабіла уплыў на выбар прафесіі—імкненне падарожнічаць.

— У нашай групе, — гэта ўжо кажа Таіса, — вы можаце многа людзей знайсці з такімі ж марамі, імкненнямі. Ды што тут гаварыць! Мы ж маладыя, дружныя, моцныя. Амаль усе — з сельскай мясцовасці. Стася Варанецкая, Ліда Кубарка, староста Віктар Мрочка і яшчэ многа завочнікаў. У першым семестры, пакуль трохі асвоіліся, было вельмі цяжка сумяшчаць работу і вучобу. У тыя дні асабліва дапамагла нам дружба, сяброўская падтрымка.

— Удзячны мы і нашым выкладчыкам Валянціне Уладзіміраўне Барушка, Уладзіміру Анатольевічу Навіцкаму, Расціславу Афанасьевічу Жмойдзяку... — Людміла гатова пералічваць яшчэ шмат імёнаў.

— Не, што ні кажыце, а першы год вучобы праляцеў як адзін дзень.

— Студэнты старэйшых курсаў нам шмат расказвалі пра летнюю практыку. Чакаем яе з нецярпеннем.

— А пакуль што на першым плане — сесія.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

Выпікі работы староста груп, курсаў, кажуць, падводзіць сесія. Але і яна таксама «аб'ект» іх работы, самы цяжкі і складаны.

Андрэй КУДЗІНАЎ, староста 5 групы III курса юрыдычнага факультэта: — Мой «стаж» старасты—адзін семестр. Гэта, канешне, мала, але, з другога боку, я яшчэ востра адчуваю сваё назначэнне, не сцёрлася навізна маёй новай якасці. Я разумею так: доуг ёсць доуг. Калі, бывае, захочаш больш часу удзяліць асабістай вучобе, успамінаеш пра сваіх студэнтау-сяброў ці яны да мяне звяртаюцца, і ідзеш да выкладчыка спытаць паконт кансультацыі або у бібліятэку па кнігі. Абавязак старасты сёння — стварыць сваім студэнтам спрыяльныя умовы для вучобы і здачы экзаменаў, хай нават пры гэтым ушчымляюцца асабістыя інтарэсы.

Таццяна СКІБІЦКАЯ, староста 3 групы III курса факультэта журналістыкі: — Калі гаварыць канкрэтна, мне вельмі хочацца зняць у сваіх студэнтау первовасць перад экзаменам. Колькі ужо пра гэта гаварылася! Экзаменуючымся давалі парады, што не трэба прыходзіць рана, каб потым сядзець ля дзвярэй гадзінамі. У нас жа так атрымліваецца: першая пяцёрка здасць, а астатнія збіраюцца толькі праз гадзіну, а перад абедам—цэлы натоуп, дзе не толькі нервовасць, але і слёзы бываюць. Спрабавала я «заганяць» студэнтаў у раніцу гадзіны па экзамен— і што? Некаторыя атрымліваюць адзнакі на бал ніжэй, чым заусёды. Відаць, гэтым людзям не хапала лішняй гадзіны для канчатковага замацавання матэрыялу. На мой погляд, самай лепшай будзе такая сістэма: перад экзаменам вывешваецца спіс прозвішчаў, і студэнты заходзяць у аудыторыю адпаведна гэтаму спісу. Парадкавыя нумары удакладняе яшчэ да экзамена староста, ён жа рэгулюе паток: калі экзаменатар прымае хутка — знаходзіць студэнтау (яны звычайна сядзяць у чытальнай зале), папярэджвае, «пахняе». І яшчэ—як важна, калі студэнт ведае, што за дзвярыма за яго хтосьці перажывае, турбуецца. Не менш адказным з'яуляецца момант «адкрыцця» экзамена. Не ва усіх хапае смеласці першым адказваць. Што ж, і тут дапамагае староста. Гэта ужо справа яго сумлення і гонару...

Запісала **С. УСЦІНОВІЧ.**

Я—СТАРАСТА

Экзамен па гістарычнаму матэрыялізму студэнты III курса ФПМ здаюць кандыдату філасофскіх навук, в. а. дацэнта кафедры філасофіі прыродазнаучых факультэтау Алены Іванауне Мішук. Разам з савецкімі юнакамі і дзяўчатамі на курсе займаюцца в'етнамскія студэнты. Зараз рыхтуюцца адказваць Ле Ті Зунг і Тонг Дзінь Кві.

Фота **А. Цыгулёва.**



ШЛЯХІ СТУДЭНЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Праблема падрыхтоукі спецыяліста, які можа свабодна арыентавацца ва узрастаючым патоку навуковай інфармацыі, які умее прымяніць свае веды для вырашэння канкрэтных навукова - тэхнічных задач не толькі сённяшняга, але і заутрашняга дня, была і застаецца галоунай.

Рашэнне важных навукова-тэхнічных задач народнай гаспадаркі патрабуе прыцягнення у шырокіх маштабах вучоных, якія працуюць у ВНУ, да вывучэння канкрэтных патрэб вытворчасці. З другога боку, аб'ём ведаў, якім валодаюць студэнты IV—V курсаў, дазваляе ім пад кіраўніцтвам вучоных рашаць рад важных практычных задач. Усё гэта стварае спрыяльныя умовы для эфектыунага развіцця творчай актыунасці студэнцтва.

Праблема развіцця творчай актыунасці студэнтау у ВНУ рэспублікі у апошні час прыцягвае увагу Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, ЦК ЛКСМБ, грамадскіх арганізацый ВНУ, вучоных і выкладчыкау. На жаль, яе рашэнне часам звязваюць з рознымі арганізацыйнымі перабудовамі вучэбна - педагагічнага працэсу, прычым часта следам за адным новаувядзеннем паяуляюцца другія, на змену адным формам развіцця НДР прыходзяць новыя паняцці. Аднак трэба ясна ўяуляць, што усякія перабудовы працэсу падрыхтоукі маладых спецыялістау павінны быць добра апрабаваны, стаць прадметам дэталёвага аналізу з боку кіраўнікоу ВНУ.

Вырашэнне праблемы удасканальвання падрыхтоукі спецыялістау у Беларускім дзяржаўным універсітэце, як і у іншых ВНУ краіны, прывяло да стварэння савета НДРС, які кардынуе намаганні прафесарска-выкладчыцкага саставу, вучоных, савета СНТ у справе развіцця даследчай работы студэнтау. Навучанне студэнтау усё больш прымае характар навукова-даследчай работы. У мінулым навучальным годзе больш 50 працэнтау кафедр універсітэта унеслі у свае планы навукова - даследчую работу студэнтау. Галоунай умовай развіцця студэнцкіх навуковых даследаванняу з'яуляецца шырокае прыцягненне студэнтау да рашэння навукова - гаспадарчых задач.

Цяпер навукова - даследчай работай займаюцца больш 7000 студэнтау. На факультэтах, пры кафедрах у НДІ ПФП, вылічальным цэнтры і пры навукова-даследчых лабараторыях створаны і паспяхова працуюць 158 студэнцкіх навуковых гурткоу і семінараў. Студэнты прымаюць непасрэдны удзел у выкананні усіх гаспадарчых дагавораў, заключаных кафедрамі, лабараторыямі, НДІ ПФП з заводамі, прадпрыемствамі, НДІ і іншымі арганізацыямі. За мінулы год студэнтамі універсітэта асвоена каля 500 тыс. рублёу. Вынікам выканання аднаго з гаспадарчых дагавораў кафедрай электрафізікі з'явілася стварэнне паўправадніковага квантавага генератара ПКГ-1, які экспанаваўся на ВДНГ СССР у 1974 годзе і на міжнароднай выстаўцы у Сафіі (НРБ). Аутары работы, у тым ліку і студэнт V курса фізфака М. Каліва, узнагароджаны сярэбраным медалём ВДНГ.

Перспектыуным шляхам удасканальвання якасці падрыхтоукі спецыялістау, развіцця студэнцкай творчасці служыць стварэнне унутрыуніверсітэцкіх навуковых аб'яднанняу пры кафедрах.

Гэта дазваляе у працэсе падрыхтоукі спецыялістау арганічна аб'ядноваць такія элементы навучання, як накапленне ведау і іх практычнае прымяненне пры вырашэнні навукова-тэхнічных задач. Цяпер ва універсітэце створаны і паспяхова працуюць 7 студэнцкіх навукова-даследчых лабараторый (СНДЛ) і вылічальных цэнтрау (СВЦ).

Важную ролю у арганізацыі НДРС і прыцягненні студэнтау да самастойнай творчасці адыгрывае студэнцкае навуковае таварыства Беларускага дзяржаунага універсітэта, якому у гэтым годзе спаўняецца 50 год.

У 1925 годзе упершыню у рэспубліцы былі арганізаваны 6 студэнцкіх краязнаучых гурткоу, якія аб'ядналі 43 студэнты—«сяброу» навукі, і 27 студэнтау — «спачуваючых», якія займаліся вывучэннем прыроды, мовы і гісторыі Беларусі. З таго часу студэнцкае навуковае таварыства у сваім развіцці прайшло далучэнне студэнтау да праблем навукі аказвае на іх вялікае выхаваучае ўздзеянне, развівае пачуццё асабістай адказнасці перад калектывам за вырашэнне пастаўленай задачы. Яркім прыкладам такога уздзеяння навуковай творчасці можа служыць гаспадарчы дагавор з адным з прадпрыемстваў г. Ленінграда, які выканала СНДЛ кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ. Вынікам калектыунай творчасці з'явілася стварэнне аналізатара АНД-1, пасля уводу якога значна павысіцца надзейнасць эксплуатацыі самалётаў і ўзрасце бяспека палетаў, а чакаемы эканамічны эфект складзе 1 млрд. рублёу.

Другі прыклад калектыунай творчасці студэнтау ужо гуманітарнага профілю — выданне у 1973 годзе зборнікау «Беларускі фальклор у сучасных запісах» і «Песні сямі вёсак», атрымаўшых добрыя водгукі чытачоу. А у 1974 годзе вынікам шматгадовай навукова-даследчай работы студэнтаў кафедры беларускай літаратуры стау зборнік «Песні народных свят і абрадаў» (рэдактар Н. С. Гілевіч).

Мы ганарымся, што былыя арганізатары студэнцкага навуковага руху ва універсітэце, якія пачалі свае першыя даследаванні яшчэ у студэнцкія гады, сталі сапраўднымі настаунікамі у навуцы. Гэта лаурэат Дзяржаунай прэміі БССР, член-карэспандэнт АН БССР Л. В. Валадзько, лаурэат прэміі Ленінскага камсамола краіны акадэмік АН БССР В. П. Платонау, лаурэат прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі, член-карэспандэнт АН БССР В. Д. Ткачоу, учарашнія студэнты, цяпер лаурэаты Дзяржаунай прэміі БССР, кандыдаты навук А. А. Ключнікау, І. Т. Краучанка, М. А. Вількоцкі, ст. навуковы супрацоунік А. В. Лянпёхін, лаурэат прэміі Ленінскага камсамола БССР, кандыдат навук М. І. Дзямчук. І цяпер найбольшых поспехаў у навуковай рабоце дабіваюцца студэнты, якія працуюць на кафедрах мікрабіялогіі пад кіраўніцтвам доктара медыцынскіх навук, прафесара Ю. К. Фамічова, гісторыі КПСС гуманітарных факультэтау (загадчык кафедры член-карэспандэнт АН БССР, прафесар У. М. Сікорскі) і кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ пад кіраўніцтвам доктара тэхнічных навук, прафесара В. В. Ізоха. Толькі за апошнія тры гады лаурэатамі усесаюзных конкурсау сталі 45 студэнтау.

Вялікая роля у арганізацыі навукова-даследчай работы належыць савету СНТ БДУ і саветам СНТ факультэтау. Савет студэнцкага навуковага таварыства працуе у цесным кантакце з партыйным камітэтам універсітэта, саветам па НДРС, навуковым кіраўніком СНТ — прарэктарам універсітэта, членам-карэспандэнтам АН БССР, прафесарам Л. В. Валадзько. Такое цеснае супрацоуніцтва дазваляе аператыуна рашаць актуальныя пытанні студэнцкай навуковай творчасці, перспектыунага планавання развіцця навуковых даследаванняу студэнтау, прыцягваць да работы у саветах СНТ студэнтау-выдатнікау. На пасяджэннях СНТ рэгулярна абмяркоуваюцца пытанні планавання розных мерапрыемстваў па арганізацыі НДРС, заслухоуваюцца справаздачы факультэцкіх арганізацый, вырашаюцца пытанні па заахвочванню студэнтау. За поспехі, дасягнутыя у арганізацыі і пастаноуцы навукова-даследчай работы студэнтау у 1974 годзе, савет студэнцкага навуковага таварыства БДУ узнагароджаны Ганаровым дыпломам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ.

Д. САКОВІЧ,
намеснік старшыні савета па НДРС, кіраунік СНДЛ БДУ;

Я. ЦІТКОЎ,
аспірант, ленінскі стыпендыят, старшыня Савета СНТ БДУ.

АГІТБРЫГАДА? АГІТБРЫГАДА!

Аутобус, паволі гойдаючыся на выбоінах і разразаючы коламі лужыны, марудна рухаецца па палявой дарозе. А у яго цесным салоне не сціхаюць шум, смех і вясёлыя студэнцкія песні. Так звычайна пачынаюцца выезды студэнцкай агітбрыгады хімічнага факультэта у падшэфныя школы.

Цяжка сказаць, калі была створана на хімфаку першая агітбрыгада. Нас, цяперашніх студэнтаў, тады яшчэ не было на факультэце. Праходзяць гады, але заусёды адноўлкава ахвотна і дружна выязджаюць юнакі і дзяўчаты на канцэрты.

Агітбрыгада у яе цяперашнім саставе была арганізавана у канцы 1973 года. Сабраліся у асноуным людзі, якія раней у такіх мерапрыемствах ніколі не удзельнічалі. Вопыту амаль ніякага, асаблівых здольнасцей таксама не зауважалася. Але затое усіх нас аб'яднаў энтузіязм, жаданне стварыць цікавую, вясёлую праграму. Гэта вырашыла усё. Хай не хапала майстэрства, але гледачы скрозь пальцы глядзелі на нашы промахі і шчыра радаваліся нашым поспехам.

На першым этапе арганізацыйнае кіраўніцтва брыгадай узяла на сябе студэнтка III курса Яугенія Радзіён. Сцэнарый пісалі самі, значная частка песень і сцэнак таксама напісана студэнтамі хімфака. Дапамагалі ветэраны, быушыя удзельнікі агітбрыгад: В. Галынскі, М. Фрэнкель, С. Філімонау.

Паступова знікала скаванасць, сталі упэунена трымацца на сцэне...

Ціхім і сарамлівым прыйшоу да нас студэнт II курса Мікола Ігнаценка. На рэпетыцыях сцінла сядзеу у кутку, уважліва пазіраў... Мы не зауважылі, як гэта здарылася, але толькі праз некалькі месяцаў Коля стаў салістам і кіраўніком агітбрыгады. Хутка асвоіліся на сцэне і іншыя: Л. Лушчык, А. Дзіжа, Н. Семянкевіч, В. Ожэгау, А. Кісель, Л. Камарчава, С. Марозава, Н. Свірыдэнка, Л. Манчанка, Г. Калер, А. Івашкевіч.

Наша асноуная аудыторыя — вучні падшэфных школ. Таму і праграму сваю мы спрабуем ператвараць у кароткае, паужартоунае апавяданне аб нашым факультэце, аб студэнцкім жыцці. Геаграфія выступленняу даволі шырокая: ад школ Мінска да Віцебскай вобласці.

Бяжыць час. Паступова уходзяць з агітбрыгады студэнты старэйшых курсаў, на змену ім прыйдуць малодшыя, прынясуць з сабой новыя ідэі, новыя пумары. Дык няхай жа іх выступленні будуць лепшымі і цікавейшымі, чым нашы. Поспехау табе, агітбрыгада!

Е. МАКАРЭВІЧ.

КЛІЧУЦЬ НОВЫЯ ДАЛЯЧЫНІ

...І зноу мы на парозе лета. Лета — час адпачынку, час святла і сонца, час вандраванняу... Кожнае лета — новае, цудоунае і зусім не падобнае на тыя, якія былі раней.

З апошняга лета «закахалася» я у гэту найцікавейшую, найцудоунейшую справу — у студэнцкі будаунічы рух.

Мне надзвычай пашанцавала: пасля другога курса мне даручылі, на мой погляд, вельмі адказную справу — асвятляць на старонках абласной газеты «Прыуралле» Уральскай вобласці жыццё і працу студэнцкіх будаунічых атрадау Беларусі.

Спачатку не усё ладзілася: былі і слёзы (ну, нічога, здаецца, не атрымліваецца!), і доугія роздумы над чыстай газетнай старонкай, якую трэба было запоуніць змястоуным і цікавым матэрыялам. Чаго толькі не было! Але запомнілася іншае.

Першая камандзіроука. Ліпеньская гарачыня. А мы ужо каторы дзень не выходзім з машыны. Аб'ездзілі некалькі раёнау, наведалі больш дзесяці будатрадау. Для мяне усё упершыню: і шырокі неабсяжны казахскі стэп, і суслікі, якія стаяць на лапках уздоуж дарогі і, здаецца, вітаюць нас, і смачная дзікая вішня... А галоунае — новыя людзі. Колькі іх, абпаленых сонцам, загартаваных цяжкімі буднямі работы, але вясёлых, нястомных, моцных... Ледзь-ледзь паспелі павячэраць, і ужо спяваюць. Надоуга запомніць казахскі стэп беларускія песні — тут і «Рэчанька», і «Алеся», і «Касіу Ясь канюшыну»... Але, мусіць, часцей спявалі «Мой горад — герой-патрыёт». Наш Мінск...

А назаутра рана-раненька зноу за работу. І паяуляюцца на казахстанскай зямлі новыя будынкі, на якіх чырвонай цэглай выкладзены словы: «Гродна», «Мінск», «Віцебск»... І яшчэ адна старонка дабавіцца у летапіс СБА.

Не, хто хоць аднойчы пабывау у студэнцкім будаунічым атрадзе, ніколі ужо не забудзе гэтага. І кожнае лета, раней за іншых здаушы сесію, ледзь паспеушы заехаць дадому развітацца з маці, прыгожыя, маладыя, у новых форменках едуць студэнты у розныя куткі Радзімы. Казахстан, Мурманск, Томск, Малдавія, Комі АССР... У гэтым годзе геаграфія расшырылася — Смаленск, Пскоу... Колькі дужых маладых рук патрэбна тут! І меліярацыя, і сельская будоуля — ды ці мала чаго! І павязуць цягнікі маладых гаспадароу зямлі будаваць новыя школы і фермы, асушваць балоты і працягваць тэлефонныя лініі...

Н. НОВІКАВА.

Т. Р. ШАРКО

12 чэрвеня 1975 года заучасна памёрла выкладчыца кафедры навуковага камунізму БДУ, член КПСС з 1945 года, Тамара Рыгораўна Шарко.

Т. Р. Шарко нарадзілася 21 красавіка 1923 года у г. Раслаулі Смаленскай вобласці у сям'і служачага. У 1943 годзе дваццацігадовай дзяўчынай добраахвотна пайшла на фронт і закончыла вайну камандзірам гарматнага разліку. У 1945—1946 гадах працавала загадчыцай партыйнага кабінета Мастоускага райкома КПБ Гродзенскай вобласці. У 1948 годзе закончыла Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ, а у 1955—гістарычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

З 1948 па 1964 год Тамара Рыгораўна знаходзілася на партыйнай рабоце у Савецкім райкоме КПБ г. Мінска, спачатку загадчыцай аддзела прапаганды і агітацыі, а потым сакратаром райкома партыі па ідэалогіі. У лютым 1964 года яна перайшла на работу у Белдзяржуніверсітэт, дзе працавала спачатку загадчыцай кабінета кафедры навуковага камунізму, а з 1966 года — выкладчыцай гэтай жа кафедры.

Знаходзячыся на выкладчыцкай рабоце, Тамара Рыгораўна усе свае сілы і веды аддавала камуністычнаму выхаванню студэнтаў. Яе адметнымі рысамі былі чуласць, прастата і сціпласць, патрабавальныя адносіны да сябе і прынцыповыя адносіны да таварышаў.

За заслугі перад Радзімай Тамара Рыгораўна Шарко узнагароджана чатырма медалямі і Ганаровай граматай Вярхоунага Савета БССР.

Памяць аб Тамары Рыгорауне захаваецца у сэрцах тых, хто яе ведаў і працаваў з ёю.

Калектыў кафедры навуковага камунізму.

СТЭНДЫ І ВЫСТАЎКІ

Кожнага, хто уваходзіць у былы корпус фізічнага факультэта, дзе цяпер размяшчаецца кафедра фізікі пауправаднікоу, сустракае вялікі стэнд, мэта якога — пазнаёміць з кафедрай. Калектыу кафедры неаднаразова быу пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве фізфака БДУ, узнагароджваўся ганаровымі граматамі рэктарата, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

***

«Да камунізму нас партыя вядзе» — кніжная выстаука пад такой назвай, прысвечаная надыходзячаму XXV з'езду КПСС, афармлена на другім паверсе бібліятэкі. Яна складаецца з трох вялікіх раздзелау: «Ленінскім курсам», «У імя трывалага міру», «Упэунены поступ пяцігодкі нашай рэспублікі».

Тут жа размясціліся тэматычныя стэнды: «Зямля — родны дом чалавецтва» і «Мінск—горад-герой».

***

Абітурыенты, што мараць у гэтым годзе паступіць вучыцца у БДУ, падоугу затрымліваюцца каля стэнда «Сардэчна запрашаем». На ім змешчаны матэрыялы і фотаздымкі, якія падрабязна знаёмяць з грамадскім і культурным жыццём універсітэта.

ЭСХІЛ

У гэтым годзе спаўняецца 2500 гадоу з дня нараджэння Эсхіла (нарадзіуся наля 525 г. да н. э., памёр у 456 г. да н. э.), старагрэчаскага драматурга.

Лёсу патрэбна было распарадзіцца так, каб грэчаскі арыстакрат ад нараджэння, храбры воін, які прымау удзел у гістарычных бітвах грэкау з персамі, Эсхіл звязаў сваю творчасць з прагрэсіунымі заваёвамі афінскай дэмакратыі і стау, па словах Энгельса, бацькам трагедыі.

Да Эсхіла публічнае прадстауленне адбывалася у форме, блізкай да рэлігійнага дзейства: адзіны артыст дэнламаваў вершы, а хор уторыу яму, згаджаючыся або спрачаючыся,—гэта была, хутчэй, лірычная кантата, чым драма. Эсхіл увёу другога артыста — і паявіуся дыялог, паявілася барацьба двух бакоу, трагічны канфлікт атрымау больш глыбокую распрацоуку, паявілася магчымасць раскрыцця унутранага свету асобы. На змену свяшчэннай кантаце прыйшло тэатральнае прадстауленне.

Эсхіл выкарыстоуваў старажытныя міфы і легенды, каб праславіць дэмакратычныя свабоды Афін. У трагедыі «Прасіцельніцы» дочкі Даная уцякаюць з Егіпта ад праследуючых іх жаніхоу і знаходзяць прытулак у Аргосе — Грэцыя у Эсхіла паустае абаронцай слабых і прыгнечаных. У «Персах» царыца Атоса пытае, хто правіць жыхарамі Афін. Карыфей хору адказвае ёй: «Не рабы яны ў смертных, не падуладны нікому!».

Светлы гуманізм Эсхіла з асаблівай сілай праявіуся ў трагедыі «Праметэй прыкаваны». Паустаушы супраць волі багоу, тытан Праметэй прынёс людзям агонь, украдзены ў багоу, адкрыу пачатак усіх рамёслау і навук і за гэта быў прыкаваны Зеусам да скалы, куды ножны дзень прылятау арол дзяубсці яго печань. Пераможаны, але не пакораны Праметэй у страсных маналогах выказвае свой пратэст супраць насільнікау-багоу.

Трагедыі Эсхіла ўзвышаныя і велічныя. Сутыкненні і страсці герояу вельмі вострыя. Мяцежная і пакутная асоба героя трагедыі раскрываецца ў сітуацыях, напоуненых драматызмам. Гераічны Этэокл, які кінуу выклік няумольнаму лёсу, багаборац Праметэй, Кліцемнестра, якую мучаць цёмныя страсці, Арэст, які помсціць за забойства бацькі... Драматургія Эсхіла прасякнута пафасам сцвярджэння законнау разумнага існавання свабоднага чалавека. Высока цаніў Эсхіла Карл Маркс, які назваў яго у ліку любімых паэтаў.

Па Ю. ВІНАГРАДАВУ.

Здымаюць фотааматары

ЦІХА ПЛАВАЕ ПА ЛЕЦЕ

ВОДАР ЧЭРВЕНЬСКІХ СУКВЕЦЦЯУ

ФОТАЭЦЮД

Т. АЛЯКСАНДРАВАЙ



«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 1.000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 00335. Заказ № 978. **Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.**

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.